# Школьны вальс даўжынёю ў 120 гадоў

*Неўгамонная памяць гартае лісты,*
*Каб знайсці той урывак старонкі,*
*Дзе гаворыць настаўнік, дзе слухаеш ты*
*Той званок з пералівамі звонкі.*

*Генадзь Рымашэўскі, выпускнік Лядзенскай сярэдняй школы 1981 г.*

**Галіна Іванаўна ФІНСКАЯ,**
дырэктар ДУА «Лядзенская сярэдняя школа Чэрвеньскага раёна»




Лядзенская школа адзначае 120-гадовы юбілей. У прасторы школьнага жыцця — гэта цэлая эпоха. За гэты час было падрыхтавана 87 выпускаў. А пачыналася ўсё ў 1903 г., калі у в. Лядна адчыніла дзверы царкоўнапрыходская школа. На пачатку 1940-х гг. установа павінна была стаць сямігодкай, але вайна ўнесла карэктывы. Летам 1944 г. Чэрвеньскі край быў вызвалены ад фашысцкіх захопнікаў. Значна пашкоджаны будынак падрамантавалі, і 1 верасня 1944 г. школа зноў пачала працаваць: 1–4-ы класы па тры на паралелі, узрост вучняў 8–15 гадоў. У 1951 г. Лядзенская школа стала сямігодкай. Дарэчы, выпуск 1954 г. быў рэкордны па колькасці медалістаў: адразу чатыры выпускнікі атрымалі сярэбраныя медалі.

Вызначальны перыяд у развіцці Лядзенскай школы — 1960–1970-я гг. Сфарміраваны калектыў настаўнікаў і традыцыі: чэмпіянат па футболе, вечары, спартыўныя мерапрыемствы, абавязковыя паходы ў канцы навучальнага года. Сярод тых, хто ўводзіў у школьнае жыццё першакласнікаў, выхоўваў і даваў веды, рыхтаваў выпускнікоў да самастойнага жыцця — цяперашнія ветэраны працы: Ала Пятроўна Вяржбіцкая, Вольга Рыгораўна Навакоўская, Баляслаў Анатольевіч Навакоўскі, Клаўдзія Адамаўна Міхіевіч, Вера Іванаўна Бабіч, Марына Аркадзьеўна Сяргейчык, Ванда Вітальеўна Марціновіч, Таццяна Фёдараўна Бабіч, Валянціна Іванаўна Грыневіч.

Важную ролю ў гісторыі школы выконвалі людзі, якія ставілі мэты, арганізоўвалі работу, кіравалі працэсамі, бралі адказнасць літаральна за ўсё і вялі за сабой. Зразумела, гэта — дырэктары. Пачынаючы з 1944 г. гэтай важнай працай займаліся 14 прафесійных і таленавітых кіраўнікоў. Цяжар аднаўлення школы і арганізацыі навучання дзяцей ваеннага часу 1 верасня 1944 г. лёг на плечы Вольгі Міхееўны Мірановіч. Эстафету кіраўніцтва прыняў Фёдар Фёдаравіч Грыбко, ён узначальваў Лядзенскую школу ў нялёгкія пасляваенныя гады з 1949 г. да 1952 г. Пад кіраўніцтвам Яфіма Піменавіча Аўсянкіна, які быў дырэктарам школы з 1953 г. да 1961 г., са сцен школы выйшаў першы выпуск 10-га класа (у 1953 г. школа стала сярэдняй).

Выпуск 1978 г. апошні атрымаў атэстаты ў старым будынку школы. Новы будынак школы быў узведзены дзякуючы дзяржаўнай падтрымцы, самаадданай працы калектыву настаўнікаў і, вядома ж, дырэктару, Казіміру Ваўжэнцьевічу Вяржбіцкаму. Выдатны педагог, ветэран Вялікай Айчыннай вайны, узнагаро-джаны ордэнам Чырвонай Зоркі, ордэнам Вялікай Айчыннай вайны II ступені, медалямі «За баявыя заслугі», «За адвагу», «За перамогу над

ЧИТАЙТЕ В СВЕЖЕМ НОМЕРЕ «ОМ»